**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**НАЦЫЯНАЛЬНЫ ІНСТЫТУТ АДУКАЦЫІ**

Вучэбная праграма

па вучэбным прадмеце

# «БЕЛАРУСКАЯ МОВА»

для I—V класаў

першага аддзялення дапаможнай школы

(дапаможнай школы-інтэрната)

з беларускай мовай навучання

*Зацверджана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

**Мінск, 2016**

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вывучэнне беларускай мовы ў I—V класах першага аддзялення дапаможнай школы накіравана на актывізацыю моўных зносін дзяцей паміж сабой і дарослымі, навучанне чытанню і пісьму, асэнсаванне граматыкі як сродку авалодання мовай. Таму **мэтай** вывучэння вучэбнага прадмета «Беларуская мова» з’яўляецца авалоданне асноўнымі відамі маўленчай дзейнасці (слуханне, гаварэнне, чытанне, пісьмо) для практычнага выкарыстання беларускай мовы ў разнастайных жыццёвых сітуацыях. Дасягненне дадзенай мэты магчыма дзякуючы скіраванасці моўнай адукацыі на фарміраванне камунікатыўнай, моўнай і сацыяльнай кампетэнцый вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю.

**Задачамі** вучэбнага прадмета з’яўляюцца:

– фарміраванне пачуццёва-вобразнага ўспрымання роднай мовы, умення слухаць і разумець пачутае;

– развіццё фанематычнага слыху (уменне выдзяляць гукі са складу, слова і дыферэнцаваць іх паміж сабой);

– навучанне правільнаму і свядомаму чытанню і пісьму, выпрацоўка абагульненых спосабаў вучэбнай дзейнасці;

– узбагачэнне лексічнага запасу навучэнцаў, развіццё звязнага маўлення, магчымасці паслядоўна і дакладна выказваць свае думкі ў вуснай і пісьмовай форме; засваенне арфаэпічных норм беларускай мовы;

– засваенне агульнапрынятых правіл моўнага этыкету і выхаванне станоўчых рыс характару;

– развіццё і карэкцыя пазнавальнай дзейнасці, маўлення і асобы навучэнцаў з інтэлектуальнай недастатковасцю;

– фарміраванне ў вучняў павагі да роднага слова, беларускай мовы, і праз гэта — пазнанне навакольнага асяроддзя, нацыянальнай культуры, самабытнасці беларускага народа;

– садзейнічанне сацыялізацыі вучняў праз авалоданне сродкамі мовы.

Навучанне роднай мове абапіраецца на наступныя тэарэтычныя падыходы:

– полікультурны (увядзенне дзіцяці ў свет агульначалавечых каштоўнасцей);

– кампетэнтнасны (авалоданне рознымі відамі камунікатыўнай дзейнасці);

– цэласна-сістэмны (вывучэнне мовы як сістэмы, узаемасувязь асноўных відаў маўленчай дзейнасці, інтэгратыўны характар навучання грамаце);

– дыферэнцыраваны падыход (улік пазнавальных магчымасцей, прыроды інтэлектуальнай недастатковасці).

Канцэптуальныя палажэнні вывучэння вучэбнага прадмета «Беларуская мова»:

– навучанне мове мае практыка-арыентаваны характар, што вызначаецца магчымасцямі і жыццёвымі патрэбамі навучэнцаў, у якіх на першым месцы стаяць практычныя навыкі карыстання мовай, і садзейнічае фарміраванню і развіццю жыццяздольнай, падрыхтаванай да самастойнага жыцця асобы навучэнцаў з інтэлектуальнай недастатковасцю;

– навучанне мове мае карэкцыйную накіраванасць, што прасочваецца як у карэкцыі фанетыка-фанематычнага і лексіка-граматычнага бакоў маўлення, так і ў фарміраванні адэкватных моўных паводзін.

Змест і структура праграмы па беларускай мове для I-V класаў першага аддзялення дапаможнай школы з беларускай мовай навучання адлюстроўвае антрапацэнтрычную канцэпцыю моўнай адукацыі. Навучанне мове арыентавана на фарміраванне моўнай асобы — чалавека, які гаворыць, піша, чытае, успрымае. У сваю чаргу, магчымасці моўнай асобы ўспрымаць і прадуцыраваць маўленчыя выказванні залежаць ад яе маўленчых і разумовых магчымасцей. На першы план вылучаецца чатырохузроўневая маўленчая дзейнасць (аўдзіраванне, чытанне, гаварэнне і пісьмо), а асноўнай адзінкай навучання становіцца вусны і пісьмовы тэкст. Граматыка робіцца сродкам

авалодання мовай ва ўсіх яе функцыях, што спрыяе фарміраванню камунікатыўна актыўнай асобы.

Праграма вучэбнага прадмета «Беларуская мова» для I—V класаў першага аддзялення дапаможнай школы з беларускай мовай навучання складаецца з наступных раздзелаў:

– навучанне грамаце і развіццё маўлення — I—II класы;
– беларуская мова — III—V класы.

Змест навучання падаецца канцэнтрычна. Прадугледжваюцца прапедэўтычныя этапы, асноўны змест паўтараецца шматразова з паглыбленнем і ўдакладненнем першапачатковых звестак.

Працягласць урока ў I класе складае 35 мінут, у II—V класах — 45 мінут. Пасля 15—20 мінут працы арганізуецца дынамічная паўза. Апошнія 10—15 мінут урока адводзяцца на замацаванне, паўтарэнне. Хатнія заданні вучням рэкамендуюцца з трэцяй чвэрці II класа, па аб’ёме яны не перавышаюць 1/3 таго, што выканана вучнем на ўроку. Пры неабходнасці асобным вучням настаўнік вызначае індывідуальную праграму навучання.

Вучэбным планам на ўрокі беларускай мовы ў I—II класах адводзіцца па 5 гадзін на тыдзень, у III—V класах — па 3 гадзіны.

## Навучанне грамаце і развіццё маўлення

## I—II класы

Навучанне грамаце разглядаецца не толькі як навучальны, але і як карэкцыйны працэс. На якасць пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў I—II класаў з лёгкай інтэлектуальнай недастатковасцю ўплываюць цяжкасці пераносу сфарміраваных ведаў, уменняў і навыкаў у новыя сітуацыі, што назіраецца ў немагчымасці выкарыстання засвоенага спосабу дзеяння, спосабу чытання складоў і напісання асобных элементаў літар у новых абставінах. Таму развіццё пазнавальнай дзейнасці дзяцей дадзенай катэгорыі патрабуе актывізацыі пачуццёвага ўспрымання, уліку большай захаванасці эмацыянальнай сферы ў параўнанні з інтэлектуальнай.

Працэс навучання ў I—II класах ускладняецца і тым, што агульнае недаразвіццё дапаўняецца спецыфічнымі асаблівасцямі. У адных дзяцей цяжкасці ў навучанні выкліканы неразуменнем слова, у другіх — неразвітасцю дробнай маторыкі, у трэціх — няздольнасцю дзейнічаць з апорай на ўзор і г. д. Адукацыйны працэс патрабуе ўліку несфарміраванасці, кароткатэрміновасці цікавасці дзяцей з інтэлектуальнай недастатковасцю да любой дзейнасці, справы і з’явы. Гэта патрабуе ад настаўніка вынаходлівасці, імправізацыі, цярплівасці, разумення, добразычлівасці і выкарыстання на ўроку разнастайных прыёмаў актывізацыі пазнавальнай дзейнасці.

Навучанне грамаце і развіццё маўлення вырашае шэраг задач, сярод якіх найбольш важнымі з’яўляюцца:

– узбагачэнне і актывізацыя маўленчага вопыту, развіццё маўлення;

– падрыхтоўка да чытання і чытанне даступнага разуменню дзяцей вучэбнага матэрыялу (складоў, слоў, сказаў);

– падрыхтоўка да пісьма і пісьмо літар, складоў, слоў;

– усебаковае развіццё сенсорнай і эмацыянальнай сфер малодшых школьнікаў і карэкцыя псіхічнага развіцця;

– фарміраванне ўменняў па задавальненні асноўных патрэб камунікацыі.

Асноўным прынцыпам, які аб’ядноўвае і арганізуе ўсю работу на ўроках навучання грамаце і мовы ў цэлым, з’яўляецца развіццё маўлення. Асобных урокаў па развіцці маўлення не прадугледжваецца. Яны не значацца ў раскладзе ўрокаў, асобна не плануюцца і не праводзяцца. Развіццё маўлення з’яўляецца неад’емнай, арганічнай часткай кожнага ўрока навучання грамаце. На кожным уроку адбываецца развіццё ўсіх маўленчых уменняў і навыкаў.

На ўроках навучання грамаце рэалізуецца камунікатыўная стратэгія навучання. Настаўнік на ўроку арганізуе і падтрымлівае матываваную маўленчую дзейнасць. Першапачаткова выкарыстоўваюцца вербальныя і невербальныя сродкі зносін у працэсе камунікацыі. Гэта абумоўліваецца

абмежаванасцю маўленчага развіцця вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю. Для ўстанаўлення кантакту і ўключэння ў сацыяльнае ўзаемадзеянне безмаўленчых вучняў вербальныя сродкі дапаўняюцца або, пры неабходнасці, замяняюцца невербальнымі (жэстамі, мімікай, рухамі, сімваламі, піктаграмамі). Фарміраванне камунікатыўнай кампетэнцыі з’яўляецца галоўнай задачай пры навучанні мове вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю. Навучанне мове накіравана не столькі на тое, каб вучань засвоіў веды пра мову, колькі на тое, каб ён навучыўся карыстацца мовай, выказваць свае патрэбнасці і жаданні, а гэта значыць разумець пачутае, гаварыць, чытаць і пісаць адэкватна сітуацыі зносін.

Навучанне грамаце разглядаецца ў кантэксце сацыялізацыі вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю. Гэта патрабуе адпаведнага сацыякультурнага развіцця, засваення правіл паводзін, прынятых у грамадстве, сацыяльных правіл выкарыстання мовы. Вучні паступова асэнсоўваюць сваё месца ў зносінах, ролю кожнага ўдзельніка зносін. Навучанне маўленчым зносінам патрабуе стварэння маўленчых сітуацый, максімальна набліжаных да натуральных. На ўроках і ў пазаўрочны час ствараюцца сітуацыі, у якіх вучань для задавальнення актуальнай камунікатыўна-пазнавальнай патрэбнасці карыстаецца мовай у вербальнай ці невербальнай форме (просіць вучэбныя прылады, якіх у яго няма, паведамляе пра жаданне ўзяць патрэбны прадмет або выканаць пэўную дзейнасць). Гэта становіцца магчымым, калі ў сітуацыях закранаюцца інтарэсы дзяцей, што, у сваю чаргу, стымулюе ўдзел у зносінах.

На ўроках навучання грамаце звяртаецца ўвага на фарміраванне маўленчых паводзін. Яны павінны адпавядаць прынятым у беларускамоўнай культуры нормам вербальных зносін, правілам этыкетных зносін: *добры дзень, дабранач, прабачце, смачна есці, выбачайце* і г. д. Дзеці знаёмяцца і засвойваюць правілы маўленчага этыкету з першых урокаў. У класе культывуюцца нацыянальна спецыфічныя, устойлівыя ўзоры зносін, якія прыняты ў беларускай культуры.

Урокі навучання грамаце рашаюць задачы карэкцыі псіхафізічнага развіцця вучняў. Карэкціруюцца ўсе пазнавальныя працэсы: адчуванні, успрыманне, уяўленне, памяць, маўленне, мысленне. У карэкцыйнай рабоце вытрымліваецца пэўная паслядоўнасць, улічваецца іерархічнасць парушэнняў. Таму галоўным у карэкцыйнай рабоце з'яўляецца карэкцыя вышэйшых псіхічных працэсаў: мыслення, маўлення, памяці, праз якія ўдасканальваюцца ранейшыя (па генезе) псіхічныя працэсы: адчуванні, успрыманне, уяўленні. Над развіццём гэтых працэсаў таксама вядзецца мэтанакіраваная карэкцыйная работа.

Праграма першага класа ўлічвае, што маўленчае развіццё дзяцей з інтэлектуальнай недастатковасцю дашкольнага ўзросту недасканалае. Працэс авалодання мовай да пачатку навучання такі, што не можа забяспечыць паспяховага засваення праграмнага матэрыялу кожнага з вучэбных прадметаў. Прызнанне прыярытэтнасці камунікатыўна арыентаванага навучання патрабуе асаблівай увагі да развіцця вуснага маўлення ў сітуацыях, якія максімальна набліжаны да рэальных умоў зносін. У маўленчай практыцы забяспечваецца розная ступень самастойнасці вучняў. Спачатку школьнікі ўзнаўляюць гатовыя ўзоры, затым з дапамогай настаўніка будуюць аналагічныя выказванні, у далейшым спрабуюць самастойна прымяняць набытыя веды.

Дасягненні ацэньваюцца па шкале «добра», «малайчына», «вельмі добра», «выдатна». Галоўным з'яўляецца не канчатковы вынік работы вучня, а станоўчая дынаміка дзейнасці вучня, яго авалоданне новымі маўленчымі ўменнямі. Стымулюецца кожная спроба вучня ўдзельнічаць у камунікацыі.

Навучанне грамаце ў дапаможнай школе працягваецца ў II класе і ажыццяўляецца на аснове гукавога аналітыка-сінтэтычнага метаду. Матэрыялам з'яўляюцца гукі і літары, склады, словы, сказы, кароткія тэксты. Прапануецца іншая, чым у агульнаадукацыйнай школе, паслядоўнасць вывучэння гукаў і літар, якая адпавядае асаблівасцям пазнавальнай дзейнасці вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю. Засваенне гука адбываецца наступным чынам: вылучэнне яго з маўлення, правільнае і выразнае

вымаўленне, адрозненне ў сукупнасці з іншымі гукамі, дыферэнцыяцыя гукаў, якія змешваюцца. Літару вывучаюць у такой паслядоўнасці: успрыманне агульнай яе формы, друкаванай і рукапіснай, вывучэнне саставу літары (элементы і іх месца), параўнанне з іншымі, раней вывучанымі літарамі. Важным момантам з'яўляецца суаднясенне гука з вобразам літары або літары з гукам, які яна абазначае.

Склады вывучаюцца паступова. Спачатку чытаюцца склады-словы *(ау, уа)*, адваротныя склады *(ам, ум)*, а потым прамыя склады *(ма, му)*, закрытыя *(сам, мох)* і склады са збегам зычных у пачатку або канцы слова *(сноп, ліст)*.

У вучняў фарміруюцца першапачатковыя навыкі чытання. Спачатку дзеці авалодваюць навыкамі злітнага чытання складоў і аднаскладовых слоў друкаванага і рукапіснага тэксту, потым чытаюць двух- і трохскладовыя словы, вызначаюць у іх націск. Адначасова вядзецца праца над удакладненнем, назапашваннем і актывізацыяй слоўніка вучняў.

Паралельна з чытаннем вучні авалодваюць элементарнымі навыкамі пісьма. Дзеці вучацца правільна сядзець за партай (сталом), карыстацца пісьмовымі прыладамі, пісаць вывучаныя літары, злучаць іх у склады і словы, пісаць літару з патрэбным нахілам, прытрымлівацца радка. Практыкаванні ў напісанні слоў, сказаў абапіраюцца на гука-літарны аналіз, папярэдні ўмоўна-графічны запіс.

Пры навучанні грамаце абавязковым з'яўляецца выкарыстанне насценнай касы літар і складоў, індывідуальных кас літар і складоў, наборнага палатна, складовых табліц, набораў для выкладвання ўмоўна-графічнага адлюстравання сказаў і слоў, складоў і гукаў. Праграмны матэрыял паслябукварнага перыяду з II класа можа быць перанесены ў III клас. Неабходнасць гэтага вызначаецца пазнавальнымі магчымасцямі вучняў.

## Беларуская мова

## III—V класы

Праграмны змест III—V класаў прадугледжвае фарміраванне ўяўленняў пра асноўныя моўныя адзінкі (тэкст, сказ, слова, гук) і рэалізуецца праз

практыкаванні лексічнага, фанетычнага, граматычнага і правапіснага характару. Азначаная дзейнасць накіравана на ажыццяўленне маўленчай дзейнасці на роднай мове, г. зн. на развіццё навыкаў слухання і разумення пачутага, чытання, гаварэння і пісьма, а таксама элементарных уменняў і навыкаў у галіне лексічнага і фанетычнага, марфалагічнага і сінтаксічнага аналізу.

Антрапацэнтрычная канцэпцыя навучання мове вызначае наступную дэдуктыўную паслядоўнасць азнаямлення з моўнымі адзінкамі: тэкст, сказ, слова, гук.

**Тэкст.** У ходзе вывучэння матэрыялу гэтага падраздзела вучні вучацца распазнаваць тэкст, адрозніваць яго ад групы сказаў, не звязаных паміж сабой па сэнсе, вылучаць назву тэксту, асноўную думку, дзяліць тэкст на часткі, упарадкоўваць дэфармаваны тэкст.

**Сказ.** Вучні вылучаюць сказ з тэксту, дзеляць тэкст на сказы, складаюць і развіваюць (пашыраюць) сказы, знаходзяць у сказе галоўныя і даданыя члены, вучацца інтанацыйна і пунктуацыйна правільна афармляць сказ.

**Слова.** У працэсе вывучэння дадзенага падраздзела вучні знаёмяцца з групамі слоў, якія абазначаюць назвы прадметаў, дзеянні і прыметы прадметаў, атрымліваюць першапачатковыя звесткі пра будову слова, вылучаюць корань, вызначаюць групы роднасных слоў, набываюць першапачатковыя ўяўленні пра лексічнае значэнне слова, відавыя і родавыя паняцці і г. д.

**Гукі і літары.** На працягу ўсіх гадоў навучання праводзіцца гука-літарны аналіз, удасканальваецца ўменне адрозніваць гук ад літары, дзяліць словы на склады. Дзеці развіваюць навыкі вымаўлення, засвойваюць правапіс слоў з ***о, э—а, е, ё—я, ў, дз, ц***, галосных пасля ***ж, ш, ч, р, дж***, ужыванне раздзяляльнага мяккага знака і апострафа, напісанне слоў з падоўжанымі зычнымі.

Фарміруюцца і ўдасканальваюцца **графічныя навыкі**: правільнае напісанне малых і вялікіх літар і іх злучэнняў, дасягненне рытмічнасці і плаўнасці пісьма. Увага да дакладнага пісьма павінна мець месца на кожным уроку (па 5—8 мінут). На ўроках праводзяцца практыкаванні па выпраўленні і папярэджанні хібаў каліграфічнага характару: непрытрымлівання нахілу літар і роўнай адлегласці паміж элементамі літар, літарамі і словамі на радку, парушэнняў паралельнасці аднолькава накіраваных штрыхоў, суразмернасці прапорцый вялікіх і малых літар, лінейнасці (захаванне аднолькавай вышыні літар на ўсім радку пісьма), скажэнне форм літар або іх асобных элементаў і інш.

## НАВУЧАННЕ ГРАМАЦЕ І РАЗВІЦЦЁ МАЎЛЕННЯ

### І КЛАС (170 гадзін)

У навучанні грамаце вылучаюць перыяды: падрыхтоўчы (прапедэўтычны), букварны (асноўны) і паслябукварны. Працягласць перыядаў вызначаецца ў залежнасці ад падрыхтаванасці вучняў да навучання грамаце.

**Падрыхтоўчы (дабукварны) перыяд**

Прыкладная працягласць падрыхтоўчага перыяду — першая чвэрць. Пры неабходнасці прапедэўтычная работа можа ажыццяўляцца і ў другой чвэрці.

У падрыхтоўчы перыяд вырашаецца праблема пераадолення ў вучняў адчужанасці, боязі і няўмення ўступаць ў зносіны з дарослымі і аднагодкамі. Настаўнік матывуе зносіны і практычнае ўзаемадзеянне. Дзеці вучацца выказваць згоду або нязгоду кіўком галавы, жэстамі; словамі і жэстамі просьбы: *дай ручку, дай кніжку, падай руку, перадай аловак, падыдзі да мяне* і г. д.

Вучняў заахвочваюць да выканання простых даручэнняў па слоўным заданні настаўніка і вучняў: *падай, прынясі, вазьмі, пакажы, схадзі* і г. д. Падчас выканання даручэнняў звяртаецца ўвага на маторыку вучня: што ўмее рабіць, як рухаецца. Урокі носяць дынамічны характар, прадугледжваюць

перамяшчэнне вучняў па класным пакоі. Вучні авалодваюць дыялогамі этыкетнага характару: прывітанне, развітанне, падзяка, прабачэнне.

Вызначаецца аб'ём разумення маўлення і ўзровень развіцця актыўнага маўлення кожнага вучня. Разуменне маўлення выяўляецца пры паказе ці выкарыстанні вучнямі добра знаёмых прадметаў, якія шырока ўжываюцца ў паўсядзённым жыцці. З гэтай мэтай вучню даюцца рэальныя прадметы ці іх выявы, набліжаныя да натуральных прадметаў або з элементарнай стылізацыяй. Слова і прадмет спачатку даюцца адначасова. Затым вучань паказвае прадмет (малюнак) па яго назве. Вучні вывучаюць прадметы і выконваюць пальчыкавую гімнастыку. Паказ прадметаў і дзеянняў можа дапаўняцца імітаваннем: *ідзе дождж, ветрык вее, коцік мыецца, сабака брэша, піла рэжа, птушка ляціць, дрэва гнецца, сякуць дровы, забіваюць цвік, шыюць адзенне, выціраюць пыл, наліваюць малако, вешаюць адзенне, абуваюць абутак* і г. д.

Устанаўліваецца ўзровень разумення маўлення кожным вучнем. Узровень можа быць нулявым, калі вучань добра чуе, але не ўспрымае маўлення тых, хто побач. Сітуатыўны ўзровень развіцця разумення маўлення адносіцца да тых выпадкаў, калі вучань разумее маўленне, разумее сэнс просьбы, звязанай з прадметамі паўсядзённага ўжытку, толькі ў добра знаёмай сітуацыі. Намінатыўны ўзровень характарызуецца тым, што вучань добра арыентуецца ў назвах прадметаў, але з цяжкасцю арыентуецца ў назвах дзеянняў. Прэдыкатыўны ўзровень развіцця маўлення адлюстроўвае веданне назваў дзеянняў. Нарэшце, расчлянёны ўзровень характарызуе тое, што вучань адрознівае змяненні ў значэнні слова, якія прыўносяцца прыстаўкамі, суфіксамі,канчаткамі.

Удакладняецца, як вучні распазнаюць і называюць прадметы, аб'ём зрокава-прасторавых успрыманняў (злева направа, зверху ўніз) і часавых уяўленняў (спачатку, затым, нарэшце). Правяраецца разуменне значэння слоў — назваў прадуктаў, адзення, посуду, гародніны і садавіны, пазнаванне гэтых і

іншых прадметаў, прад’яўленых у незвычайным ракурсе, ва ўмовах візуальнай зашумленасці.

Здзяйсняецца работа па класіфікацыі прадметаў па колеры, форме, велічыні, матэрыяле, прызначэнні, па абагульненні і групоўцы прадметаў. Тэмы: звяры, птушкі, насякомыя, дрэвы, кустарнікі, травы, адзенне, абутак, мэбля, посуд, інструменты, машыны. Напрыклад: *кот, сабака, елка* — якія словы можна аб’яднаць у адну групу? Дзяцей вучаць выключаць лішні прадмет. Напрыклад: *певень, курыца, мядзведзь* — хто лішні?

Слоўнікавая работа ў падрыхтоўчы перыяд заключаецца ва ўдакладненні і пашырэнні ўяўленняў вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю пра навакольную рэчаіснасць і развіцці на гэтай аснове маўлення. Гэта задача вырашаецца як у працэсе назіранняў і экскурсій, так і пры рабоце над сюжэтнымі карцінкамі, прадметнымі малюнкамі, серыямі ілюстрацый да казак, вершаў, апавяданняў. Дзеці суадносяць словы з прадметамі і з’явамі навакольнага асяроддзя.

Лексічны матэрыял (па азначаных тэмах) уводзіцца і прапрацоўваецца ў наступнай паслядоўнасці:

– словы-гукаперайманні;

– словы, якія складаюцца з двух аднолькавых складоў: *баба, ляля, няня, тата, мама*;

– словы з двух складоў з націскам на першым складзе: *Ніна, мыла, каша, рама, сані*;

– аднаскладовыя словы: *кот, суп, лоб, нос, лес, мяч*;

– двухскладовыя словы з націскам на другім складзе: *вада, нага, рука, бурак*;

– двухскладовыя словы са збегам зычных і трохскладовыя словы: *шапка, лыжка, агурок.*

Лагічныя практыкаванні прадугледжваюць аналіз, сінтэз, параўнанне. Вучні пазнаюць прадмет па яго частцы, вылучаюць прыметы прадмета,

параўноўваюць, абагульняюць і групуюць прадметы, знаходзяць недакладнасці: чаго не бывае, што намалявана няправільна.

Развучваюцца кароткія вершы з голасу настаўніка. Прадметныя карцінкі абазначаюцца словам. На падставе карцінак складваюцца простыя сказы. Слуханне казак і апавяданняў падмацоўваецца наглядным матэрыялам і драматызацыяй. Выконваюцца інструкцыі: *пакажы, выберы, параўнай, прынясі, пакладзі, падымі, знайдзі, дай* і г. д.

Дабукварны перыяд забяспечвае падрыхтоўку да чытання і ўключае работу над тэкстам, сказам, словам, складам, гукам.

**Тэкст.** Агульнае ўспрыманне тэксту. Складанне тэксту па сюжэтным малюнку з дапамогай настаўніка (пытанні і адказы на іх).

**Сказ.** Практычнае знаёмства са сказам. Выдзяленне слоў у сказе. Падлік колькасці слоў (2—3 словы). Схема сказа. «Чытанне сказаў» па схеме. Складанне сказаў да карцінак. Выдзяленне сказаў з вуснага маўлення.

**Слова.** Практычнае знаёмства са словам. Схема слова. «Чытанне» зафіксаваных слоў, жэстаў, выразу твару. Падбор слоў да карцінак. Вылучэнне слоў у вусным маўленні.

**Склад.** Практычнае знаёмства са складам як часткай слова. Дзяленне слоў на склады. Плаўнае і пескладовае прагаворванне слоў, адстукванне, адпляскванне складовага саставу слова. «Чытанне» слоў па складах з апорай на схемы да прадметных карцінак.

**Гук.** Адрозненне гукаў навакольнай рэчаіснасці і моўных гукаў. Адпрацоўка дакладнага, правільнага гукавымаўлення ў складах, словах, сказах, тэкстах (вершы, забаўлянкі). Развіццё слыхавога ўспрымання на матэрыяле гульнёвых практыкаванняў. Вылучэнне гука і яго кадзіраванне ўмоўным значком. Падбор слоў на зададзены гук з апорай на малюнкі. Распазнаванне зададзенага гука ў словах. Вызначэнне месца гука ў слове: у пачатку, у канцы. Кадзіраванне гукаў у слове і раскадзіраванне слова пад прадметнай карцінкай па графічнай схеме.

**Букварны перыяд**

**Першы этап. Вывучэнне гукаў і літар:** ***а, у, о, м, с, х.***

Правільнае і выразнае вымаўленне вывучаемых гукаў. Распазнаванне іх у пачатку, у сярэдзіне і ў канцы слова. Літара як знак для абазначэння гука на пісьме. Суаднясенне літары з гукам. Практычнае адрозненне пры чытанні галосных і зычных. Утварэнне слоў з прапанаваных гукаў і літар і чытанне гэтых слоў: ***ау, уа, ах, ох***. Утварэнне і чытанне адваротных і прамых, адкрытых і закрытых складоў: ***ам, ом, ум, ма, му, мо, ас, ос, ус, са, со, су, ах, ух, ох, ха, ху, хо*** і інш. Параўнанне складоў. Складанне і чытанне слоў з двух складоў: ***ма-ма, са-ма, му-ха*** і г. д.

Утварэнне і чытанне трохлітарных слоў, якія складаюцца з аднаго закрытага складу: ***сам*** і да т. п.

Навучанне пісьму. Выкананне бардзюраў. Напісанне вывучаных літар па ўзоры, замалёўка іх. Пісьмо друкаваных літар, якія вывучалі.

**Другі этап. Гукі і літары** ***ш, л, н, ы, р, і, к, п, т.***

Вызначэнне месца гука і літары ў слове (у пачатку, у сярэдзіне, у канцы слова). Абазначэнне гукаў літарамі. Складанне літар з дзвюх палачак: **Т, Х, Л, У**. Складанне літар з трох палачак: **А, Н**. Складанне літар з чатырох палачак: **М, Ш**. Пазнаванне літары па адным яе элеменце, пры накладанні адной на другую. Вылучэнне літары сярод тых, якія напісаны люстравана. Канструяванне літар з мазаікі, стужак, кавалачкаў паперы, з асобных элементаў. Пераўтварэнне літар на аснове агульных элементаў: **Л—А**. Называнне і параўнанне падобных літар.

**ЧЫТАННЕ СКЛАДОЎ І СЛОЎ**

Чытанне адваротных і прамых двухгукавых складоў. Параўнанне складоў.

Складанне слоў са складоў з апорай на прадметны малюнак. Умоўна-графічная схема слоў. Дапаўненне складу да складу для ўтварэння новага слова. Чытанне слоў, якія складаюцца з аднаго і двух складоў (настаўнік

выбірае найбольш прыдатны спосаб: гукавы аналітыка-сінтэтычны, цэлых слоў, «па падабенстве», з падмацаваннем рухамі рук і інш.).

**НАВУЧАННЕ ПІСЬМУ**

Развіццё дробнай маторыкі пальцаў рук.

Развіццё каардынацыі рухаў кісці рукі і пальцаў. Вырэзванне карцінак, правядзенне гарызантальных, вертыкальных і нахіленых прамых ліній.

Напісанне друкаваных літар, якія вывучалі (па трафарэтах і адвольна). Выкананне бардзюраў, якія складаюцца з прамых ліній, з ліній з закругленнем уверсе і ўнізе. Напісанне авалаў, паўавалаў, ліній з пяцелькай.

Напісанне літар па ўзоры, дамалёўка літар, напісанне кароткіх слоў. Вялікая літара ў пачатку сказа. Кропка ў канцы сказа (практычнае знаёмства).

## ВУЧНІ АВАЛОДВАЮЦЬ УМЕННЯМІ

**Камунікатыўная кампетэнцыя**

***Слуханне:***

– разумець маўленне настаўніка і іншых дарослых ці дзяцей у сацыяльна-побытавай, вучэбнай, гульнёвай сітуацыях;

– адэкватна эмацыянальна рэагаваць на пачутае;

– успрымаць мінімальны тэкст на слых;

– вылучаць сказ з вуснага маўлення;

– вылучаць словы ў сказе, які прачытаў ці сказаў настаўнік;

– распазнаваць гукі на слых, адрозніваць гукі навакольнай рэчаіснасці і гукі мовы;

– вылучаць гук і кадзіраваць яго ўмоўным значком;

– вызначаць месца гука ў слове: у пачатку, у канцы.

***Гаварэнне:***

– адказваць на простыя пытанні;

– удзельнічаць у гутарцы з настаўнікам на зразумелую тэму;

– агучваць дзеянні, якія выконваюцца;

– расказваць на памяць загадкі, пацешкі, скорагаворкі і інш.;

– удзельнічаць у дыялогах этыкетнага характару (могуць быць выкарыстаны вербальныя і невербальныя сродкі);

– удзельнічаць у дыялогах, якія суправаджаюць сумесную дзейнасць (узаемадзеянне ў працэсе працы, гульні);

– дакладна, правільна вымаўляць гукі (у складах, словах, сказах, тэкстах);

– плаўна і паскладова прагаворваць словы;

– называць намаляваныя прадметы ці прадметы навакольнага асяроддзя;

– шукаць словы, якія пачынаюцца з пэўнага гука, з апорай на малюнкі;

– падлічваць колькасць слоў (2—3 словы);

– складаць сказы да малюнкаў;

– падбіраць словы да малюнкаў;

– складаць тэкст па сюжэтным малюнку з дапамогай настаўніка (пытанні і адказы на іх);

– удзельнічаць у дыялогах, якія суправаджаюць вучэбную дзейнасць.

***Чытанне:***

– чытаць літары, склады, словы з вывучаных літар;

– «чытаць» сказы і словы па схеме і кадзіраваць іх з дапамогай умоўных значкоў (графічныя схемы).

***Пісьмо:***

– засвойваць гігіенічныя навыкі пісьма: правільную пасадку, размяшчэнне сшытка, ручкі і інш.;

– пісаць вывучаныя літары і іх спалучэнні.

**Сацыяльная кампетэнцыя:**

– культуры паводзін у час вучэбнай, працоўнай ці гульнёвай дзейнасці;

– культуры ўзаемаадносін з дарослымі (настаўнікамі, членамі сям'і, незнаёмымі людзьмі);

– ацэньвання ўласных паводзін і паводзін іншых людзей;

– выказвання сацыяльных эмоцый (цікавасць да навакольнага жыцця, вучобы, жаданне дапамагчы, паспачуваць іншаму чалавеку, уменне радавацца сваім поспехам і поспехам іншых дзяцей).

## II КЛАС (170 гадзін)

## НАВУЧАННЕ ГРАМАЦЕ І РАЗВІЦЦЁ МАЎЛЕННЯ

### ЧЫТАННЕ

**Першы** і **другі** этапы. Гукі і літары ***а, у, о, м, с, х, ш, л, н, ы, р, і, к, п, т***.

Чытанне сказаў з двух-трох слоў.

Чытанне тэкстаў з двух-трох сказаў.

### ПІСЬМО

Адпрацоўваць рукапіснае напісанне вывучаемых літар, вялікіх і малых.

Спісванне з друкаванага і рукапіснага тэксту літар і складоў.

Спісванне з рукапіснага тэксту слоў, якія ўтвораны з вывучаных складоў.

Пісьмо пад дыктоўку асобных літар, складоў, слоў пасля іх гука-літарнага аналізу.

**Трэці этап. Гукі і літары *з, в, ж, б, г, д, й, ь, е, ё, я, ю.***

### ЧЫТАННЕ

Дакладнае вымаўленне зычных гукаў.

Вызначэнне месца гука і літары ў слове.

Практычнае адрозненне галосных і зычных гукаў. Дыферэнцыяцыя парных зычных у складах і словах.

Утварэнне і чытанне адваротных, прамых, адкрытых і закрытых складоў з цвёрдымі і мяккімі зычнымі ў пачатку складу, чытанне закрытых складоў з мяккім зычным на канцы: *ка, ко, кі, па, пы, пі, за, зу, зо, зі, аз, ань, унь* і інш.

Складанне і чытанне па складах слоў з двух складоў: *ка-за, ва-за, жа-ба, та-та, ва-зі* і інш.

Складанне і чытанне па складах слоў з трох складоў: *да-ро-га, ры-ба-кі, ва-ро-ты* і інш.

Чытанне сказаў з двух-чатырох слоў з адпаведнай інтанацыяй канца сказа.

Чытанне невялікіх тэкстаў з двух-чатырох сказаў. Падбор слова, сказа, тэксту да малюнка. Выбар патрэбнага малюнка да слова, сказа, тэксту з шэрага падобных.

**ПІСЬМО**

Засваенне рукапіснага напісання малых і вялікіх літар ***з, в, ж, б, г, д, й, ў, ь, е, ё, я, ю.***

Спісванне з рукапіснага і друкаванага тэксту літар, складоў, слоў.

Пісьмо па ўзоры сказаў з двух слоў.

Вялікая літара ў пачатку сказа, кропка на канцы.

Пісьмо пад дыктоўку літар, складоў, простых слоў пасля іх гука-літарнага аналізу.

Складанне і запіс вывучаных складоў.

Спісванне слоў пад малюнкам з устаўкай прапушчанай літары.

**Чацвёрты этап: гукі і літары *ч, э, ў, ц, дз, ф, дж. Апостраф.***

**ЧЫТАННЕ**

Дакладнае вымаўленне усіх гукаў. Практыкаванні ў правільным вымаўленні гукаў, спецыфічных для беларускай мовы *(ч, ў, дж, дз)*. Пошук гэтых гукаў у словах.

Практычнае адрозненне галосных і зычных гукаў, цвёрдых і мяккіх зычных.

Утварэнне і чытанне складоў, у тым ліку са збегам двух зычных.

Утварэнне і чытанне слоў з аднаго-трох складоў.

Чытанне сказаў з двух-пяці слоў з інтанацыяй канца сказа, пытання і воклічу.

Чытанне тэксту з гэтых сказаў.

Вызначэнне назвы тэксту. Вызначэнне, пра каго або пра што гаворыцца ў тэксце.

Суаднясенне ілюстрацый і слоўнага матэрыялу. Выбар патрэбнай ілюстрацыі з шэрага падобных.

Знаходжанне і чытанне ў тэксце сказаў, слоў да малюнка, пытання, задання.

Чытанне з прыдумваннем канца апавядання па малюнку, апорных словах, заданні.

Развучванне вершаў, пацешак, скорагаворак, загадак на слых і прачытаных у буквары.

**Паслябукварны перыяд**

Чытанне спецыяльна складзеных або падабраных складоў, слоў, сказаў, тэкстаў на замацаванне цяжкіх у засваенні гукаў і літар, апазіцыйных гукаў, груп зычных гукаў, што змешваюцца (звонкія і глухія, свісцячыя і шыпячыя); груп літар, падобных па напісанні; цяжкіх для вымаўлення складоў; слоў з 4—5 складоў.

Развучванне невялікіх вершаў, загадак з голасу і па кнізе.

Пры нізкім узроўні пазнавальных магчымасцей вучняў паслябукварны перыяд можа быць перанесены ў ІІІ клас.

**Пазакласнае чытанне.** Разглядванне і чытанне (чытанне-разглядванне) невялікіх маляўнічых кніг для дзяцей дашкольнага ўзросту. Знаходжанне назвы кнігі, твора і прозвішча аўтара.

**ПІСЬМО**

Засваенне рукапіснага напісання малых і вялікіх літар, апострафа.

Спісванне з друкаванага і рукапіснага тэксту складоў, слоў і сказаў з трох-чатырох слоў.

Вялікая літара ў імёнах людзей.

Напісанне на слых літар і складоў.

Напісанне пад дыктоўку слоў і сказаў з двух-чатырох слоў з папярэднім іх аналізам.

Самастойнае складанне і запіс слоў з дзвюх-чатырох літар.

Падстаноўка прапушчаных літар у словах пры спісванні.

Кантрольнае спісванне.

## ВУЧНІ АВАЛОДВАЮЦЬ УМЕННЯМІ

**Камунікатыўная кампетэнцыя**

***Слуханне:***

– разумець маўленне настаўніка і іншых дарослых ці дзяцей у сацыяльна-побытавай, вучэбнай, гульнёвай сітуацыях;

– адэкватна эмацыянальна рэагаваць на пачутае;

– асэнсавана ўспрымаць тэкст з 2—4 сказаў на слых;

– вылучаць сказы з вуснага маўлення;

– вылучаць словы ў сказе, які прачытаў ці сказаў настаўнік;

– вылучаць гукі са слова і кадзіраваць іх умоўнымі значкамі;

– вызначаць месца гука ў слове: у пачатку, у канцы;

– рабіць гукавы аналіз слоў (адрозніваць галосныя і зычныя гукі, дыферэнцыраваць парныя зычныя ў складах і словах).

***Гаварэнне:***

– дакладна вымаўляць гукі;

– адказваць на пытанні настаўніка на зразумелую тэму;

– моўна суправаджаць дзеянні, якія выконваюцца;

– расказваць на памяць кароткія вершы, загадкі, пацешкі, скорагаворкі і інш.;

– удзельнічаць у дыялогах этыкетнага характару з выкарыстаннем вербальных і невербальных сродкаў;

– маўленча ўзаемадзейнічаць у працэсе працы, гульні, пры выкананні вучэбных дзеянняў;

– плаўна і паскладова прагаворваць словы;

– падбіраць слова, сказ да малюнка;

– адшукваць словы, якія пачынаюцца з пэўнага гука, з апорай на малюнкі;

– «чытаць» сказы і словы па схеме і кадзіраваць іх з дапамогай умоўных значкоў (графічныя схемы);

– падлічваць колькасць слоў (3—4 словы);

– складаць сказы да малюнкаў;

– падбіраць словы да малюнкаў;

– складаць тэкст па сюжэтным малюнку з дапамогай настаўніка (пытанні і адказы на іх);

– удзельнічаць у дыялогах, якія суправаджаюць вучэбную дзейнасць.

***Чытанне:***

– чытаць услых тэксты з двух-чатырох сказаў;

– чытаць услых сказы з двух-чатырох слоў з адпаведнай інтанацыяй канца сказа;

– чытаць услых словы з трох-чатырох складоў;

– утвараць і чытаць услых адваротныя, прамыя, адкрытыя і закрытыя склады з цвёрдымі і мяккімі зычнымі ў пачатку і ў канцы;

– чытаць (разглядваць) невялікія маляўнічыя кнігі для дзяцей дашкольнага ўзросту; знаходзіць назву кнігі, твора і прозвішча аўтара.

***Пісьмо:***

– гігіенічных навыкаў пісьма: правільнай пасадкі, размяшчэння сшытка, ручкі і інш.;

– рукапіснага напісання літар беларускага алфавіта;

– спісвання асобных слоў, сказаў і тэкстаў (друкаваны і рукапісны варыянт);

– пісьма пад дыктоўку асобных літар, складоў, слоў пасля іх гука-літарнага аналізу;

– пісьма па ўзоры сказаў з двух-чатырох слоў;

– спісвання слоў пад малюнкам з устаўкай прапушчанай літары;

– напісання на слых літар і складоў;

– самастойнага складання і запісу слоў з дзвюх-чатырох літар;

– пісьма вялікай літары ў пачатку сказа, кропкі ў канцы; вялікай літары ў імёнах людзей;

– кантрольнага спісвання.

**Сацыяльная кампетэнцыя:**

– культуры паводзін у разнастайных сацыяльных сітуацыях, у тым ліку такіх, якія патрабуюць выкарыстання невербальных сродкаў зносін;

– этыкету ўзаемаадносін з дарослымі і аднагодкамі (знаёмымі і незнаёмымі);

– эмацыянальнага стаўлення да ўласных паводзін і паводзін іншых людзей;

– выказвання сацыяльных эмоцый (цікавасць да ўсяго, што адбываецца ў школе, жаданне прыйсці на дапамогу, паспачуваць іншаму чалавеку, магчымасць радавацца сваім поспехам і поспехам іншых дзяцей).

## БЕЛАРУСКАЯ МОВА

## ІІІ КЛАС (105 гадзін)

### ПАЎТАРЭННЕ ВЫВУЧАНАГА Ў ІІ КЛАСЕ (8 гадзін)

### ТЭКСТ (10 гадзін)

Элементарнае ўяўленне пра тэкст. Назва тэксту.

Упарадкаванне дэфармаванага тэксту (з 2-3 сказаў).

Адказы на пытанні настаўніка па тэксце.

Стварэнне тэксту па серыі малюнкаў.

### СКАЗ (20 гадзін)

Вылучэнне сказа з тэксту ці з вуснага маўлення.

Графічнае адлюстраванне сказа.

Вялікая літара ў пачатку сказа і кропка ў канцы.

Вызначэнне ў сказе колькасці слоў. Паслядоўнасць слоў у сказе.

Утварэнне сказа з прапанаваных слоў (у патрэбнай форме), па пытанні, па малюнку.

Заканчэнне сказа.

**СЛОВА (30 гадзін)**

Вычляненне слова са сказа.

Практычнае азнаямленне са словамі, якія абазначаюць назву прадмета. Пастаноўка да іх пытанняў *хто? што?*

Распазнаванне слоў, якія абазначаюць: адзін і некалькі аднолькавых прадметаў *(дом — дамы, лялька — лялькі)*; частку прадмета і цэлы прадмет *(сцябло — дрэва, кветка)*; некалькі падобных прадметаў *(канапа, ложак)*.

Групоўка слоў, што абазначаюць прадметы *(цацкі, мэбля, агароднiна, садавіна, адзенне, посуд)*. Падбор абагульняючага слова.

Вялікая літара ў імёнах, прозвішчах людзей, у мянушках жывёл.

Распазнаванне слоў, якія называюць дзеянні прадметаў. Пастаноўка да іх пытанняў *што робіць? што робяць? што рабіў?*

Вылучэнне са сказаў слоў, якія называюць дзеянне.

Адрозненне прадметаў па дзеянні.

Выяўленне некаторых прымет прадметаў па пытаннях *які? якая? якое? якія?* (колер, форма, велічыня, матэрыял).

**ГУКІ І ЛІТАРЫ (30 гадзін)**

Вылучэнне гукаў са слоў.

Гукі і літары. Гука-літарны аналіз слоў.

Галосныя і зычныя гукі і літары, якія іх абазначаюць; іх адрозненне.

Галосныя гукі і літары, якія іх абазначаюць. Абазначэнне шасці галосных гукаў *а, о, э, і, ы, у* дзесяццю літарамі: *а, о, э, і, ы, у, я, ё, е, ю*. Гукі, якія абазначаюць літары *я, ё, е, ю* ў пазіцыі пасля зычнага.

Зычныя гукі і літары, якія іх абазначаюць.

Цвёрдыя і мяккія зычныя гукі, іх адрозненне. Абазначэнне мяккасці зычных гукаў на пісьме літарамі *я, ё, е, ю, і.*

Літара *ь*. Выкарыстанне яе для абазначэння мяккасці зычных гукаў на пісьме.

Звонкія і глухія зычныя гукі і іх літары.

Літары і гукі *д, дз, дж*.

Літары і гукі *у*—*ў*, іх адрозненне (*у* — галосны, *ў* — зычны).

Літары і гукі *і*—*й*, іх адрозненне (*і* — галосны, *й* — зычны).

Склад як частка слова. Падзел слова на склады. Перанос слоў па складах (з дапамогай настаўніка).

Націск. Вылучэнне націску ў словах, выяўленне націскных і ненаціскных складоў.

**ПАЎТАРЭННЕ ВЫВУЧАНАГА ЗА ГОД (7 гадзін)**

**ПІСЬМО І ЧЫСТАПІСАННЕ**

Адпрацоўка правільнага напісання малых і вялікіх літар і іх злучэнняў.

Замацаванне гігіенічных навыкаў пісьма: правільнай пасадкі, размяшчэння сшытка, ручкі і інш.

Выкананне пісьмовых заданняў з дапамогай настаўніка.

Спісванне (з рукапіснага і друкаванага тэксту; з дапісваннем прапушчаных літар, выбарачнае, кантрольнае). Складанне слоў — надпісаў да малюнкаў — з літар разразной азбукі.

Дыктанты (літарныя, складовыя, слоўнікавыя; зрокавыя, слыхавыя, папераджальныя, тлумачальныя, кантрольныя).

Запіс пад дыктоўку кароткіх сказаў.

## ВУЧНІ АВАЛОДВАЮЦЬ УМЕННЯМІ

**Камунікатыўная кампетэнцыя**

***Слуханне:***

– разумець маўленне дарослых і дзяцей у разнастайных сацыяльных сітуацыях;

– адэкватна эмацыянальна ўспрымаць пачутае.

***Гаварэнне:***

– удзельнічаць у дыялогах побытавага характару;

– удзельнічаць у дыялогах этыкетнага характару з выкарыстаннем вербальных і невербальных сродкаў;

– моўна суправаджаць дзеянні, якія выконваюцца;

– расказваць на памяць кароткія вершы, загадкі, пацешкі, скорагаворкі і інш. і выказваць сваё стаўленне да расказанага;

– моўна ўзаемадзейнічаць у працэсе працы, гульні, пры выкананні вучэбных дзеянняў.

***Чытанне:***

– дакладна вымаўляць гукі пры чытанні;

– чытаць услых невялікія тэксты і выражаць разнастайныя эмацыянальныя станы ў працэсе чытання.

***Пісьмо:***

– валодаць гігіенічнымі навыкамі пісьма;

– спісваць друкаваны і рукапісны тэкст (3—5 сказаў);

– запісваць пад дыктоўку кароткія сказы;

– спісваць з дапаможніка, дошкі рукапісны і друкаваны тэкст;

– спісваць з дапісваннем прапушчаных літар;

– спісваць выбарачна;

– складаць словы — надпісы да малюнкаў — з літар разразной азбукі;

– пісаць дыктанты (літарны, складовы, слоўнікавы; зрокавы, слыхавы, папераджальны, тлумачальны, кантрольны).

**Моўная кампетэнцыя:**

– адказваць на пытанні настаўніка па тэксце і вызначаць тэму тэксту; знаходзіць назву тэксту;

– вызначаць колькасць сказаў у тэксце;

– упарадкоўваць дэфармаваны тэкст (з 2—3 сказаў);

– ствараць тэкст па серыі малюнкаў;

– пісаць вялікую літару ў пачатку сказа, ставіць адпаведныя знакі прыпынку ў канцы сказа;

– вызначаць колькасць слоў у сказе;

– складаць сказы з прапанаваных слоў (у патрэбнай форме), па пытаннях, па малюнку;

– дапаўняць сказ словам, якое падыходзіць па сэнсе;

– вылучаць словы, якія абазначаюць назву прадмета, ставіць да іх пытанні *хто? што?*;

– вылучаць словы, якія абазначаюць: адзін і некалькі аднолькавых прадметаў *(дом — дамы, лялька — лялькі)*; частку прадмета і цэлы прадмет *(сцябло — дрэва, кветка)*; некалькі падобных прадметаў *(канапа, ложак)*;

– групаваць словы, што абазначаюць прадметы *(цацкі, мэбля, агароднiна, садавіна, адзенне, посуд)*, падбіраць абагульняючае слова;

– пісаць вялікую літару ў імёнах, прозвішчах людзей, у мянушках жывёл;

– распазнаваць словы, якія называюць дзеянні прадметаў, ставіць да іх пытанні *што робіць? што робяць? што рабіў?*;

– выяўляць прыметы прадметаў па пытаннях *які? якая? якое? якія?* (колер, форма, велічыня, матэрыял);

– знаходзіць пэўны гук у слове;

– суадносіць гук і літару ў слове, рабіць гука-літарны аналіз слоў, у якіх супадае колькасць гукаў і літар;

– абазначаць галосныя і зычныя гукі літарамі;

– адрозніваць цвёрдыя і мяккія зычныя; абазначаць мяккасць зычных гукаў на пісьме літарамі ***я, ё, е, ю, і***, літарай ***ь***;

– адрозніваць звонкія і глухія зычныя гукі;

– адрозніваць літары і гукі ***у—ў, і—й***;

– дзяліць слова на склады, пераносіць словы па складах на пісьме (з дапамогай настаўніка);

– вызначаць націскныя і ненаціскныя склады.

**Сацыяльная кампетэнцыя:**

– карыстацца правіламі этыкету ва ўзаемазносінах са знаёмымі і незнаёмымі людзьмі;

– дэманстраваць прасацыяльныя паводзіны (жаданне прыйсці на дапамогу, паспачуваць іншаму чалавеку і інш.);

– перажываць і паказваць разнастайныя эмоцыі (радасць, смутак, гора, віна, сорам і іншыя ў сувязі з адпаведнымі падзеямі);

– устанаўліваць добразычлівыя сяброўскія зносіны з людзьмі;

– правільна ацэньваць сітуацыі і рабіць адэкватны маральны выбар.

## IV КЛАС (105 гадзін)

### ПАЎТАРЭННЕ ВЫВУЧАНАГА Ў III КЛАСЕ (8 гадзін)

### ТЭКСТ (10 гадзін)

Тэкст і група сказаў, не аб’яднаных сэнсава. Адрозненне тэкстаў ад асобных сказаў, якія не аб’яднаны па сэнсе. Распазнаванне тэксту і нетэксту.

Тэма тэксту. Назва.

Чырвоны радок у пачатку тэксту. Абзац.

Узнаўленне дэфармаванага тэксту з дапамогай серыі малюнкаў.

Падзел тэксту на сказы.

Сувязь сказаў у тэксце. Назіранне за заменай назвы прадмета асабовымі займеннікамі *(я, ён, яна, яно, ты, яны, ім, іх, яго, яму, яе, ёй, ёю).*

Пераказ тэксту па пытаннях і па дадзеным плане.

Калектыўнае складанне невялікага тэксту на аснове ўласных назіранняў, па сюжэтным малюнку з дапамогай пытанняў.

### СКАЗ (20 гадзін)

Сказ як адзінка маўлення.

Вычляненне сказа з тэксту.

Вызначэнне, пра што або пра каго гаворыцца ў сказе.

Графічнае адлюстраванне сказа.

Вялікая літара ў пачатку сказа і кропка ў канцы.

Заканчэнне сказа адным або некалькімі словамі з дапамогай пытанняў.

Пашырэнне сказа адным або некалькімі словамі па пытаннях *які? якая? якое? якія?*

Складанне сказаў па пытаннях настаўніка.

Упарадкаванне дэфармаванага сказа, у якім словы знаходзяцца ў патрэбнай форме.

**СЛОВА (30 гадзін)**

Вычляненне слова са сказа.

Словы як назвы прадметаў, прымет, дзеянняў.

Словы, якія абазначаюць назвы прадметаў.

Вызначэнне слоў — назваў прадметаў па пытаннях *хто? што?*

Падбор слоў, якія адказваюць на пытанні *хто? што?* на пэўную тэму.

Ужыванне дадзенай катэгорыі слоў у розных формах у залежнасці ад сувязі іх з іншымі словамі ў сказе па пытаннях *каго? чаго? каму? чаму? каго? што? кім? чым? аб кім? аб чым?*

Вялікая літара ў імёнах, імёнах па бацьку, прозвішчах людзей, мянушках жывёл, у назвах гарадоў, вёсак, вуліц. Хатні адрас. Адрас школы.

Словы, якія абазначаюць дзеянні прадметаў.

Распазнаванне слоў, якія абазначаюць дзеянні прадметаў, у сказах.

Называнне слоў па пытаннях *што робіць? што рабіў? што зрабіў? што зробіць? што будзе рабіць?*

Дапасаванне па пытаннях слоў, якія абазначаюць дзеянні, да слоў, якія абазначаюць назвы прадметаў.

Словы, якія абазначаюць прыметы прадметаў.

Называнне прыметы прадмета па пытаннях *які? якая? якое? якія?* Падбор некалькіх слоў — назваў прымет аднаго прадмета.

Дапасаванне па пытаннях слоў, якія абазначаюць прыметы прадметаў, да слоў — назваў прадметаў.

Складанне спалучэнняў слоў па малюнках.

Пашырэнне сказаў словамі, якія абазначаюць прыметы прадметаў.

**ГУКІ І ЛІТАРЫ (30 гадзін)**

Вычляненне гукаў са слоў.

Назіранне за вымаўленнем гукаў у слове, за залежнасцю лексічнага значэння ад гукавога саставу слова: *кот — кіт — кут, шыба — шына — шыла; вочы — ночы; шар — пар — жар.*

Літара як графічнае адлюстраванне гука.

Алфавіт. Чытанне літар алфавіта.

Выкарыстанне алфавіта: размяшчэнне слоў у алфавітным парадку (спіс вучняў класа).

Літары ***е, ё, ю, я, і*** і іх гукі ў пачатку слова або склада.

Гук і літара ***й.*** Адрозненне гукаў ***й*** і ***і***. Гук і літара ***ў***. Назіранне за чаргаваннем ***в—ў*** *(трава — траў-ка)*, ***л—ў*** *(вучыла — вучыў)*. Правапіс літары ***ў*** у сярэдзіне і пачатку слова.

Абазначэнне мяккасці зычных на пісьме літарамі ***е, ё, і, ю, я***. Напісанне літар ***а, о, у, ы, э*** пасля цвёрдых зычных і ***е, ё, і, ю, я*** пасля мяккіх зычных.

Абазначэнне мяккасці зычных на пісьме мяккім знакам ***(ь)***.

Мяккі знак як літара, якая не абазначае гука.

Падзел слоў на склады.

Правільны перанос слоў. Асаблівасці пераносу слоў з літарамі ***дз*** *(ся-дзець)*, ***дж*** *(ся-джу)*, ***й*** *(со-ней-ка)*, ***ў*** *(лаў-ка)*, ***ь*** *(кань-кі).*

Гукі і літары ***д—дз*** і ***т—ц***. Напісанне літар ***дз, ц*** перад галоснымі літарамі ***е, ё, і, ю, я*** *(горад — у горадзе, лета — аб леце).*

Зацвярдзелыя зычныя ***ж, ш, р, ц, ч, дж*** і літары ***а, о, у, ы, э*** пасля іх.

Націск. Адрозненне націскных і ненаціскных складоў. Вызначэнне націску ў слове. Знак націску.

Залежнасць правапісу літар галосных гукаў ***о, э, а*** і ***е, ё, я*** ад націску. Вымаўленне і напісанне ***о, э*** пад націскам, ***а*** — на месцы ***о, э*** ў ненаціскным становішчы *(ногі — нага, рэкі — рака).* Вымаўленне і напісанне *я* на месцы *е, ё* ў першым пераднаціскным складзе *(несці — нясу, сёстры — сястра).*

Раздзяляльныя знакі: апостраф *(сям'я, вераб'і)* і мяккі знак *(палью, паштальён).* Вымаўленне слоў з раздзяляльнымі знакамі.

Падоўжаныя зычныя. Вымаўленне слоў з падоўжанымі зычнымі. Абазначэнне падоўжаных зычных на пісьме. Правапіс слоў з падоўжанымі зычнымі. Правілы пераносу такіх слоў.

Гука-літарны аналіз слоў.

**ПАЎТАРЭННЕ ВЫВУЧАНАГА ЗА ГОД (7 гадзін)**

**ПІСЬМО І ЧЫСТАПІСАННЕ**

Выпрацоўка навыкаў каліграфічна правільнага пісьма і спісвання з паступовым паскарэннем тэмпу пісьма.

Дакладнае і графічна правільнае пісьмо малых і вялікіх літар у парадку ўскладнення іх напісання:

1) і, ш, І, Ш, п, р, т, г;
2) л, м, Л, М; я Я, А;
3) у, ц, Ч ч;
4) с С, е Е, о О, а, д, б;
5) ь, ы і іх варыянты ў літарных злучэннях;
6) н, ю, Н, Ю, к К;
7) В, З з, э Э, ж Ж, х Х, ф.
8) Ф, У, Г, П, Т, Р, Б, Д.

Выкананне пісьмовых заданняў.

Кантрольнае спісванне. Выбарачнае спісванне.

Пісьмо пад дыктоўку сказаў і невялікіх тэкстаў (10-20 слоў).

Зрокавыя, слыхавыя, тлумачальныя, папераджальныя, кантрольныя дыктанты.

## ВУЧНІ АВАЛОДВАЮЦЬ УМЕННЯМІ

**Камунікатыўная кампетэнцыя**

***Слуханне:***

– успрымаць на слых і разумець пачутае (маўленне людзей у разнастайных сацыяльных сітуацыях, тэле- і радыёпраграмы);

– эмацыянальна рэагаваць на пачутае.

***Гаварэнне:***

– удзельнічаць у разнастайных дыялогах: этыкетнага характару (прывітанне, знаёмства, прабачэнне і г. д.); побытавага характару (здароў'е, адпачынак, вучоба і г. д.);

– складаць маналогі (расказ пра сябе, сваю сям'ю і г. д.);

– выказваць уражанні ад стасункаў з аднакласнікамі, іншымі дзецьмі, дарослымі;

– выказваць уражанні ад пачутага, убачанага (у тым ліку тэле- і радыёпраграм);

– размаўляць па тэлефоне на зразумелыя тэмы;

– расказваць вершы, загадкі, пацешкі, скорагаворкі, вывучаныя на памяць;

– узаемадзейнічаць з дапамогай маўлення ў працэсе працы, гульні, пры выкананні вучэбных дзеянняў.

***Чытанне:***

– дакладна вымаўляць гукі пры чытанні, паступова авалодваючы арфаэпічнымі нормамі беларускай мовы;

– чытаць услых невялікія тэксты.

***Пісьмо:***

– захоўваць гігіенічныя навыкі пісьма;

– спісваць друкаваны і рукапісны тэкст;

– запісваць пад дыктоўку кароткія сказы;

– пісаць запіску бацькам;

– пісаць хатні адрас;

– удасканальваць напісанне малых і вялікіх літар і іх злучэнняў;

– спісваць з дапісваннем прапушчаных літар;

– спісваць выбарачна;

– складаць словы — надпісы да малюнкаў — з літар разразной азбукі;

– пісаць дыктант (літарны, складовы, слоўнікавы; зрокавы, слыхавы, папераджальны, тлумачальны, кантрольны).

**Моўная кампетэнцыя:**

– адрозніваць тэкст ад асобных сказаў, якія не аб’яднаны паміж сабой па сэнсе;

– вызначаць тэму тэксту;

– дзяліць тэкст на сэнсавыя часткі;

– узнаўляць дэфармаваны тэкст з дапамогай серыі малюнкаў;

– дзяліць тэкст на сказы;

– пераказваць тэкст па пытаннях і па прапанаваным плане;

– складаць невялікі тэкст на аснове ўласных назіранняў (калектыўная работа);

– калектыўна складаць невялікі тэкст па сюжэтным малюнку з дапамогай пытанняў;

– вычляняць сказ з тэксту;

– вызначаць, пра што або пра каго гаворыцца ў сказе;

– пашыраць сказ адным або некалькімі словамі па пытаннях *які? якая? якое? якія?*;

– складаць сказы па пытаннях;

– графічна адлюстроўваць сказ;

– упарадкоўваць дэфармаваны сказ, у якім словы знаходзяцца ў адпаведнай граматычнай форме;

– вычляняць слова са сказа;

– знаходзіць у сказе і падбіраць словы, якія абазначаюць назвы прадметаў, па пытаннях;

– ужываць словы ў розных формах у залежнасці ад сувязі іх з іншымі словамі ў сказе (змяненне па пытаннях *каго? чаго? каму? чаму? каго? што? кім? чым? аб кім? аб чым?*);

– пісаць вялікую літару ў імёнах, імёнах па бацьку, прозвішчах людзей, мянушках жывёл, назвах гарадоў, вёсак, вуліц;

– знаходзіць у сказе і падбіраць словы, якія абазначаюць прыметы прадметаў, па пытаннях;

– падбіраць некалькі слоў — назваў прымет аднаго прадмета;

– пашыраць сказы словамі, якія абазначаюць прыметы прадметаў;

– знаходзіць у сказе і падбіраць словы, якія абазначаюць дзеянні прадметаў, па пытаннях *(што робіць? што рабіў? што зрабіў? што зробіць? што будзе рабіць?)*;

– рабіць гука-літарны аналіз слоў;

– практычна карыстацца алфавітам: размяшчаць словы ў алфавітным парадку (спіс вучняў класа);

– правільна пісаць літару ***ў*** у сярэдзіне і пачатку слова;

– пісаць літары ***а, о, у, ы, э*** пасля цвёрдых зычных і ***е, ё, і, ю, я*** пасля мяккіх зычных;

– абазначаць мяккасць зычных на пісьме мяккім знакам;

– дзяліць словы на склады, правільна пераносіць словы;

– пісаць літары ***а, о, у, ы, э*** пасля ***ж, ш, р, ц, ч, дж***;

– вызначаць націск у слове;

– вымаўляць і пісаць ***о, э*** пад націскам, ***а*** — на месцы ***о, э*** ў ненаціскным становішчы *(ногі — нага, рэкі — рака)*;

– вымаўляць і пісаць ***я*** на месцы ***е, ё*** ў першым складзе перад націскам *(несці — нясу, сёстры — сястра)*;

– пісаць словы з раздзяляльнымі знакамі: апостраф *(сям'я, вераб'і)* і мяккі знак *(палью, паштальён)*;

– вымаўляць і пісаць словы з падоўжанымі зычнымі.

**Сацыяльная кампетэнцыя:**

– карыстацца правіламі моўнага этыкету ў разнастайных сітуацыях;

– усведамляць сацыяльна-эмацыянальны кантэкст камунікацыі (пагадзіцца, пасумнявацца, выказаць недавер, асудзіць і г. д.);

– устанаўліваць добразычлівыя стасункі з людзьмі.

# V КЛАС (105 гадзін)

## ПАЎТАРЭННЕ ВЫВУЧАНАГА Ў IV КЛАСЕ (6 гадзін)

## ТЭКСТ (14 гадзін)

Тэкст. Тэма тэксту. Назва тэксту, якая адлюстроўвае тэму.

Асноўная думка тэксту.

Паслядоўнасць сказаў у тэксце.

Афармленне групы сказаў у тэкст, выключэнне сказа, які не звязаны з тэмай.

Часткі тэксту. Чырвоны радок.

Сувязь частак тэксту з дапамогай ланцужка слоў: *спачатку, потым, пасля, нарэшце.*

Упарадкаванне дэфармаванага тэксту.

Адрас на канверце. Напісанне пісьма родным або знаёмым.

Вуснае і пісьмовае віншаванне.

## СКАЗ (25 гадзін)

Сказ як адзінка маўлення.

Падзел маўлення (тэксту) на сказы.

Складанне сказаў па пытаннях.

Вылучэнне ў сказе слоў, якія ўказваюць, пра каго або пра што гаворыцца ў сказе, што гаворыцца.

Галоўныя (дзейнік і выказнік) і даданыя (без падзелу на віды) члены сказа.

Вылучэнне дзейніка і выказніка.

Сказы з галоўнымі і даданымі членамі.

Пашырэнне сказаў даданымі членамі з дапамогай малюнка, пытання. Устанаўленне сувязі паміж словамі ў сказе па пытаннях.

Упарадкаванне дэфармаванага сказа.

Сказы, розныя па інтанацыі.

Знакі прыпынку ў канцы сказа (кропка, пытальнік, клічнік).

Практыкаванні ў пастаноўцы знакаў прыпынку па зададзенай у сказе інтанацыі.

**СЛОВА (25 гадзін)**

Паняцце пра ролю слова ў мове.

Сэнсавае значэнне слова. Знаёмства з тлумачальным слоўнікам беларускай мовы.

Словы, блізкія і супрацьлеглыя па сэнсе. Мнагазначныя словы.

Роднасныя словы. Агульная частка роднасных слоў (корань).

Практыкаванні ў падборы аднакаранёвых слоў.

Словы — назвы прадметаў, прымет і дзеянняў. Пастаноўка пытанняў да іх. Знаходжанне ў сказе такіх слоў па пытаннях.

Складанне спалучэнняў слоў на зададзеную тэму. Пастаноўка пытанняў да слоў у спалучэннях.

Асабовыя імёны.

Вялікая літара ў назвах краін, рэк, азёр, мораў.

Словы *у, на, з, па, да, ад, пад, над, каля* і інш., якія выконваюць у сказе службовую (дапаможную) ролю.

Асобнае напісанне гэтых слоў з іншымі словамі.

**ГУКІ І ЛІТАРЫ (25 гадзін)**

Гукі і літары. Гука-літарны аналіз слоў. Суаднясенне гука і літары ў словах. Несупадзенне па колькасці гукаў і літар у словах. Значэнне алфавіта. Сферы выкарыстання алфавіта.

Мяккі знак ***(ь)*** у канцы і ў сярэдзіне слоў.

Раздзяляльныя знакі: апостраф і мяккі знак. Іх правапіс у асобных словах.

Падзел слоў на склады. Правілы пераносу слоў.

Літары ***е, ё, і, ю, я*** і гукі, якія яны абазначаюць.

Правапіс ***д—дз, т—ц***.

Звонкія і глухія зычныя. Вымаўленне звонкіх і глухіх зычных у канцы і ў сярэдзіне слова перад глухімі. Падбор праверачных слоў і правапіс звонкіх і глухіх зычных.

Правапіс ***о, э—а; е, ё—я***.

**ПАЎТАРЭННЕ ВЫВУЧАНАГА ЗА ГОД (7 гадзін)**

**ПІСЬМО І ЧЫСТАПІСАННЕ**

Замацаванне навыкаў правільнага і акуратнага пісьма з далейшым паскарэннем тэмпу.

Дакладнае і графічна правільнае напісанне вялікіх літар:

1) І, Ц, Ш, Ч, Л, М, А;

2) О, С, З, Х, Ж, Е, Э, Я;

3) У, Н, К, Ю, Р, В;

4) Г, П, Т, Б, Ф, Д.

Практыкаванні ў безадрыўным напісанні злучэнняў літар тыпу: *ол, ое, во, вл, се, од, ас, об, уе, до, св* і інш.

Звязнае, рытмічнае пісьмо слоў, сказаў і невялікіх тэкстаў.

Выкананне пісьмовых заданняў па падручніку ў адпаведнасці з інструкцыяй.

Спісванне з рукапіснага і друкаванага тэксту з прагаворваннем цэлых слоў і словазлучэнняў. Кантрольнае спісванне. Выбарачнае спісванне.

Пісьмо пад дыктоўку сказаў і тэкстаў з захаваннем вывучаных норм правапісу.

Зрокавыя, слыхавыя, папераджальныя, тлумачальныя, кантрольныя дыктанты.

## ВУЧНІ АВАЛОДВАЮЦЬ УМЕННЯМІ

**Камунікатыўная кампетэнцыя**

***Слуханне:***

– успрымаць на слых маналагічнае ці дыялагічнае маўленне, вызначаць асноўную думку пачутага;

– адэкватна эмацыянальна рэагаваць на пачутае.

***Гаварэнне:***

– атрымліваць разнастайную інфармацыю дзякуючы магчымасці падтрымліваць дыялог;

– складаць маналог (расказ пра свайго таварыша, школу і г. д.);

– выказваць уражанні ад зносін з людзьмі, ад убачанага ці пачутага;

– падтрымліваць размову па тэлефоне;

– выказваць прабачэнне, просьбу аб дазволе, прапанову, спачуванне, незадавальненне і г. д.

***Чытанне:***

– чытаць у адпаведнасці з арфаэпічнымі нормамі беларускай мовы;

– чытаць услых невялікія тэксты розных жанраў і выражаць разнастайныя эмацыянальныя станы ў працэсе чытання.

***Пісьмо:***

– валодаць каліграфічнымі навыкамі і гігіенай пісьма;

– спісваць з друкаванага і рукапіснага тэксту;

– пісаць запіску, пісьмо сваякам ці таварышам, адрас на канверце, віншаванне;

– пісаць адрас школы;

– правільна і акуратна пісаць і спісваць з паступовым паскарэннем тэмпу пісьма;

– выконваць пісьмовыя заданні па падручніку ў адпаведнасці з інструкцыяй;

– выбарачна спісваць;

– пісаць пад дыктоўку сказы і тэксты з захаваннем вывучаных норм правапісу;

**Моўная кампетэнцыя:**

– адлюстроўваць тэму тэксту ў яго назве, суадносіць тэму, асноўную думку і назву тэксту;

– размяркоўваць сказы ў тэксце ў пэўнай сэнсавай паслядоўнасці;

– афармляць часткі тэксту з чырвонага радка;

– упарадкоўваць дэфармаваны тэкст;

– дзяліць тэкст на сказы; складаць сказы па пытаннях;

– вылучаць у сказе словы, якія ўказваюць, пра каго або пра што гаворыцца ў сказе і што гаворыцца; вылучаць дзейнік і выказнік (галоўныя члены сказа);

– знаходзіць даданыя члены сказа; пашыраць сказы даданымі членамі (з выкарыстаннем малюнка, пытання); устанаўліваць сувязі паміж словамі ў сказе па пытаннях;

– упарадкоўваць дэфармаваны сказ;

– выбіраць необходны знак прыпынку для канца сказа (кропка, пытальнік, клічнік);

– карыстацца тлумачальным слоўнікам беларускай мовы;

– падбіраць роднасныя словы; знаходзіць агульную частку роднасных слоў (корань);

– падбіраць словы, блізкія і супрацьлеглыя па сэнсе;

– вызначаць мнагазначныя словы з дапамогай тлумачальнага слоўніка;

– вызначаць па пытаннях словы — назвы прадметаў, словы, якія абазначаюць прыметы — і словы, якія абазначаюць дзеянні, знаходзіць такія словы ў сказе;

– складаць спалучэнні слоў на вызначаную тэму, ставіць пытанні да слоў у спалучэннях;

– правільна пісаць асабовыя імёны, назвы краін, рэк, азёр, мораў;

– асобна пісаць словы *у, на, з, па, да, ад, пад, над, каля* і інш., якія выконваюць у сказе службовую (дапаможную) ролю;

– ажыццяўляць гука-літарны аналіз слоў;

– суадносіць гук і літару ў словах;

– пісаць словы, у якіх не супадае колькасць гукаў і літар;

– пісаць мяккі знак ***(ь)*** на канцы і ў сярэдзіне слоў;

– пісаць словы з апострафам;

– дзяліць словы на склады, пераносіць словы з радка на радок;

– правільна пісаць ***д—дз, т—ц***;

– падбіраць праверачныя словы і правільна пісаць звонкія і глухія зычныя;

– правільна пісаць ***о, э—а; е, ё—я***;

**Сацыяльная кампетэнцыя:**

– выкарыстоўваць правілы моўнага этыкету ў разнастайных сітуацыях;

– адэкватна паводзіць сябе ў разнастайных сітуацыях з улікам сацыяльна-эмацыянальнага кантэксту камунікацыі;

– устанаўліваць добразычлівыя стасункі з людзьмі;

– дэманстраваць маральны выбар у вербальнай і невербальнай формах.

## РЭКАМЕНДАВАНАЯ ЛІТАРАТУРА

1. *Бобла, І. М.* Дабукварны перыяд навучання грамаце ў беларускамоўнай дапаможнай школе / І. М. Бобла, В. М. Краўчанка, Ф. І. Шаласава // Дэфекталогія. — 1996. — Вып. 5.

2. *Бобла, І. М.* Навучанне чытанню ў букварны перыяд ў беларускамоўнай дапаможнай школе / І. М. Бобла, В. М. Краўчанка, Ф. І. Шаласава // Дэфекталогія. — 1997. — Вып. 6.

3. *Змушко, А. М.* Методыка моўнай адукацыі вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю : вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў дапам. шк. / А. М. Змушко. — Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2009. — 96 с.

4. *Змушко, А. М.* Змест моўнай адукацыі вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю // Образование и педагогическая наука : тр. Нац. ин-та образования / ред. кол. Змушко А. М. (пред.) [и др.]. — Сер. 6: Образование лиц с особенностями психофизического развития.— Минск : НИО, 2008. — Вып. 2. — Методики и технологии. — С. 101—107.

5. *Змушко, А. М.* Стан і перспектывы навучання беларускай мове ў дапаможнай школе / А. М. Змушко // Спецыяльная адукацыя. — 2014. — № 2. — С. 9—13.

6. Методыка выкладання беларускай мовы ў пачатковых класах / пад рэд. А. П. Шанько. — Мінск : Вышэйшая школа, 1986.

7. *Шылько, Т. М.* Скажы па-беларуску / Т. М. Шылько. — Мінск : Пачатковая школа, 2004.

8. *Яленскі, М. Г.* Асобасны падыход у методыцы навучання беларускай мове / М. Г. Яленскі. — Мінск : НІА, 1997.

9. *Яленскі, М. Г.* Лінгвадыдактычная парадыгма асобасна арыентаванага навучання беларускай мове / М. Г. Яленскі. — Мінск : НІА, 2002.